*Настаўнік прапануе*

# ПРАБЛЕМА РАЗВІЦЦЯ НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ У ПАЭМЕ “СЫМОН-МУЗЫКА” ЯКУБА КОЛАСА

## УРОК БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (X КЛАС)

**Мэта:** вызначыць ідэйную накіраванасць твора, разгледзець праблему развіцця народных талентаў у паэме; развіваць лагічнае мысленне, інтэлектуальныя здольнасці; стварыць спрыяльныя ўмовы для адкрытых выказванняў вучняў пра свае адносіны да герояў твора; выхоўваць павагу да нацыянальнай гісторыі.

**Абсталяванне:** ілюстрацыі В. Александровіча да паэмы “Сымон-музыка”, фотаздымак плошчы Якуба Коласа ў Мінску.

**Эпіграф:** Талентамі вымяраюць поспехі цывілізацыі, і яны ж з'яўляюцца верставымі слупамі гісторыі, якія служаць тэлеграмамі ад продкаў і сучаснікаў да нашчадкаў.

К. Пруткоў.

Колькі талентаў звялося…

Я. Колас.

### ХОД УРОКА

**I. Арганізацыйны момант.**

***• Пераход да ўспрымання новага матэрыялу.***

***• Гутарка па пытаннях.***

**Настаўнік.** Што такое талент? Як вы думаеце, наяўнасць таленту можа паўплываць на лёс чалавека?

*Адказы вучняў.*

**Настаўнік.** Сапраўды, вашы меркаванні слушныя. Што датычыцца слова *талент*, то ў “Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы” яно падаецца так: “Талент – надзвычайныя прыродныя здольнасці”. І зразумела, талент адыгрывае не апошнюю ролю ў жыцці чалавека.

*Настаўнік агучвае тэмы ўрока. Вучні фармулююць мэты ўрока.*

**Настаўнік.** Якуб Колас быў не першым і не апошнім пісьменнікам, які задумаў напісаць твор менавіта пра вытокі мастацтва, пра складаную супярэчлівую душу мастака, перад якой шырока, мнагалучна адкрываюцца прыгажосць і таямніцы свету. Хто яшчэ з творцаў звяртаўся да гэтай тэмы?

*Вучні атрымалі апераджальнае заданне падрыхтаваць паведамленні на тэму “Праблема развіцця народных талентаў і яе адлюстраванне ў творах беларускай літаратуры”.*

***• Паведамленні вучняў.***

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***• Гутарка па тэме.***

**Настаўнік.** З вобразам якога героя і ў якім творы раскрываецца праблема развіцця народных талентаў? (*Паэма “Сымон-музыка” і галоўны герой – Сымон.*)

Як вы лічыце, твор Якуба Коласа – гэта пераказ ранейшых твораў на дадзеную тэму ці яшчэ адна спроба аўтара паразважаць пра ролю мастака ў грамадстве? (*Адказы вучняў.*) Пісьменнік імкнуўся даследаваць вытокі народнага мастацтва, “прасачыць” працэс нараджэння таленту. Давайце і мы паспрабуем гэта зрабіць. Пачнём з дзяцінства Сымона. Якім яно было? Ці цяжка яму было? (*Прырода шчодра надзяліла Сымона дапытлівым розумам, чуйным успрыманнем усіх гукаў. У гэтым таленце бацькі не бачаць матэрыяльнай выгоды.*)

**Настаўнік.** Паглядзіце на ілюстрацыю В. Александровіча. Які, на вашу думку, першы складнік таленту? (*Прыродны дар.*)

*На дошцы запісана слова “талент”.*

*Вучні запісваюць у сшыткі першы складнік таленту.*

**Настаўнік.** Якія падзеі з'явіліся лёсавызначальнымі ў жыцці Сымона? (*Смерць дзеда Курылы, адзінага чалавека, які разумеў Сымона; выгнанне з хаты.*)

Хлопчыку трэба было выжыць. Застаўшыся адзін, Сымон павінен быў сарыентавацца. Ён сустрэў нямала людзей на сваёй жыццёвай дарозе. Хто быў першым чалавекам на яго шляху? (*Жабрак.*)

Чаму Сымон уцякае ад жабрака? (*Жабрак спрытна выкарыстоўваў здольнасці музыкі, каб болей нажабраваць. “Грош завёўся ў дзеда ў лапах – запамог Сымон яму”. Аднак не скваппасць, не хітрасць старога сталі прычынаю сутычкі хлапчука з дзедам, а разыходжанні ў поглядах на жыццё, на мэты чалавечага існавання. Няма сэнсу імкнуцца ў надземныя высі, марыць пра недасяжныя ідэалы, бо той, хто народжаны цягаць торбу, павінен гэта рабіць цярпліва. Сымону не па душы рабская філасофія жабрака. Ён марыў сваёй песняй адкрыць людзям вочы, запаліць прамень надзеі на лепшае жыццё. Маральная несумяшчальнасць пазіцый хлопца і жабрака-прыстасаванца прывяла да таго, што Сымон пакідае старога.*)

**Настаўнік.** Сымон трапляе ў карчму. Як карчмар Шлёма паставіўся да яго таленту? (*Карчмар

*таксама скарыстаў яго дзеля ўласнай выгоды. Шлёма зразумеў, што азначае для яго камерцыі скрыпка ў руках таленавітага хлопца.)*

**Настаўнік.** Які наступны этап вандравання Сымона? (*Княжацкі замак: ён быў нечакана "злоўлены" князем у лесе. Уражаны незвычайным, цудоўным граннем музыкі, князь забірае хлопца ў замак. Доўгія тры гады сталі новым этапам яго біяграфіі, духоўнага і інтэлектуальнага развіцця.*)

Да чаго імкнецца Сымон? (*Авалодаць музычнай граматай.*)

Ці ўдалося яму дасягнуць гэтага? (*Не, бо пан Галыга хоць і ацаніў талент Сымона-імправізатара, але дапамагаць не захацеў.*)

Чаму? (*Для яго "саматужны Шапэн" быў ніжэйшай істотай. Галыга лічыў, што адукаваны "хлоп" – вялікая небяспека для вышэйшай касты. Сваё філасофскае крэда ён выкладае так: "Вось затым сама прырода / Вас пускае слепаком, / Каб з вас менша была шкода. / Раз мужык – будзь мужыком, / Маеш хлеб – і жуй цішком, / Будзь даволен сваей доляй". Чалавечая годнасць прыніжана, нанесена маральная крыўда. Але адначасова гэта і штуршок да далейшага "прасвятлення". Хлопец пачынае ўсведамляць сацыяльную несправядлівасць. Расце варожасць да панскага асяроддзя. Тут завяршылася, можна сказаць, сацыяльная адукацыя Сымона-музыкі, які цяпер стаў лепш усведамляць сябе абаронцам народных інтарэсаў. "Павандруе ў свет з скрыпуляй, / Песні будзе ён складаць, / Ён людзей дабром атуліць, / Каб палёгку людзям даць".*)

**Настаўнік.** Такім чынам, другі складнік таленту – сацыяльная арыентацыя (усведамленне свайго прызвання). А што яшчэ спрыяе натхненню мастака? (*Каханне – гэта трэці складнік таленту.*)

*На дошцы схема.*




**Настаўнік.** Якім жа павінна быць сапраўднае мастацтва? (*Яно павінна быць свабодным, непадкупным, служыць людзям.*) Ці патрэбны нам таленавітыя людзі? Для чаго існуе мастацтва? Паразважайце над гэтымі пытаннямі ў міні-сачыненні. Звярніце ўвагу на эпіграф нашага ўрока, уключыце яго змест у разважанні.

**III. Абагульненне.**

• ***Творчая работа.***

*Зачытваюцца міні-сачыненні вучняў.*

**IV. Падвядзенне вынікаў.**

**Настаўнік.** Мастацтва акрыляе чалавека, узнімае яго над жыццёвай прозай, кліча на барацьбу. Невычэрпныя магчымасці мае мастацтва, калі яно абараняе дабрыню. А таленавітыя людзі здольныя ўзняць Беларусь на новы ўзровень жыцця.

**V. Дамашняе заданне.**

*Падрыхтаваць паведамленне "Будучае Сымона і Ганны" або "Мой варыянт помніка Сымону" (на дошцы фотаздымак плошчы Якуба Коласа).*

**VI. Рэфлексія.**

**Таццяна ЛАПІЦКАЯ,**
настаўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
сярэдняй школы № 49 г. Мінска.

*У метадычную скарбонку*

# МЕТАДЫЧНАЯ СПАДЧЫНА ЯКУБА КОЛАСА

У 1910 г. Канстанцін Міцкевіч падрыхтаваў адзін з першых вучэбных дапаможнікаў на беларускай мове "Другое чытанне для дзяцей беларусаў". Тэксты для дапаможніка напісаў або апрацаваў сам, таму яны вызначаюцца высокай мастацка-эстэтычнай вартасцю. Ён таксама аўтар кнігі "Методыка роднай мовы" (1926) – першага ў гісторыі айчыннай лінгваметодыкі навукова-метадычнага дапаможніка для настаўнікаў. У ім знайшлі адлюстраванне асабісты педагагічны вопыт Канстанціна Міцкевіча і дасягненні айчыннай і замежнай метадычнай навукі таго часу. Вызначыўшы задачы навучання роднай мове і прынцыпы выкладання яе ў школе, Якуб Колас дае кароткі агляд метадаў навучання грамаце. Асобна раскрывае методыку чытання, пісьма, коратка закранае пытанне пра выкладанне граматыкі беларускай мовы. У заключнай частцы кнігі робіць крытычны аналіз буквароў.

*Працяг чытайце на с. 78.*